А.Дз. Цеплякова

ДРУГАСНЫЯ КРЫНІЦЫ ПАХОДЖАННЯ АНГЛАМОЎНЫХ ЗАПАЗЫЧАННЯЎ КРЫЛАТЫХ СЛОЎ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЕ

Агульная колькасць англамоўных запазычанняў крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове складае больш за 100 адзінак. Яны паходзяць як з уласна англійскіх, так і з іншых крыніц.

Крылатых слоў з уласна англійскіх крыніц налічваецца 95 адзінак. З іх у тлумачальным слоўніку "Крылатыя выразы ў беларускай мове" (2004) пад рэдакцыяй Я.Я. Іванова [1] зафіксавана 36 адзінак, а ў "Этымалагічным слоўніку фразеалагізмаў" (2004) І.Я. Лепешава [2] – 2 адзінкі. У выніку праведзенага аналізу тэкстаў розных функцыянальных стыляў мы вылучылі шляхам франтальнай выбаркі яшчэ 57 адзінак, шырокае ўжыванне якіх у сучаснай беларускай літаратурнай мове пацвярджаецца шматлікімі прыкладамі.

Крылатых слоў, якія трапілі, на наш погляд, у беларускую мову праз англійскую, налічваецца 7 адзінак, з іх 6 зафіксавана ў слоўніку крылатых выразаў пад рэдакцыяй Я.Я. Іванова [1] і яшчэ 1 вызначана паводле праведзенага намі аналізу тэкстаў рознай функцыянальна-стылістычнай прыналежнасці.

Крыніцы паходжання англамоўных запазычанняў крылатых слоў можна размежаваць на адзінкавыя і комплексныя (калі існуе больш чым адна актуальная тэкставая крыніца). Адзінкавыя крыніцы дыферэнцыруюцца на першасныя (арыгінальныя) і другасныя (неарыгінальныя). Першасныя крыніцы паходжання маюць толькі англамоўныя запазычанні крылатых слоў з уласна англійскіх крыніц.

Другасныя крыніцы паходжання крылатых слоў не з'яўляюцца арыгінальнымі. Крылатыя словы з другасных крыніц былі запазычаны, у сваю чаргу, з іншых літаратурных, фальклорных і г.д. тэкстаў (першакрыніц). Дзякуючы аўтарытэту аўтараў другасных крыніц і/або вядомасці іх твораў такія выразы сталі шырока вядомымі і набылі "крылатасць". Пры гэтым звесткі аб першакрыніцы з'яўляюцца неактуальнымі (або ўвогуле невядомымі) для носьбітаў мовы (першая крыніца аказваецца забытай або напаўзабытай, паколькі выраз стаў вядомым дзякуючы свайму другаснаму выкарыстанню).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Першакрыніцы тых выразаў, якія сталі крылатымі дзякуючы ўжыванню ў другасных крыніцах, могуць быць як уласна англійскія, так і няўласна англійскія.

1. Уласна англійскія першакрыніцы можна размежаваць на наступныя: **а) літаратурныя творы**, напр.: *кірмаш пыхлівасці* < *Vanity Fair* (Дж. Бэньян, "Pilgrim's Progress", 1678–1684; выраз набыў крылатасць пасля выдання аднайменнага рамана У.М. Тэкерэя, 1848) і інш.; **б) тэксты музычных твораў**, напр.: *уся каралеўская рацьь* < *all the king's men* (выраз з англійскай народнай дзіцячай песенькі пра Шалтая-Балтая; стаў шырока вядомым пасля выхаду ў свет аднайменнага рамана Р.П. Уорэна, 1946) і інш.; **в) фальклорныя творы**, напр.: *круглы стол* < *the round table* (выраз з кельцкіх народных легенд пра караля брытаў Артура, V–VI стст.; стаў крылатым пасля выдання рамана Т. Мэлары "The Death of Arthur", 1469) і інш.; **г) тэксты масавай камунікацыі**, напр.: *Мой дом – мая крэпасць* < *My house is my castle* (выслоўе – афіцыйная юрыдычная фармулёўка ў англійскім судзе; стала шырока вядомым пасля выхаду ў свет трактата англійскага юрыста Э. Кока "The Third Part of the Institutes of the Laws of England", 1628) і інш.; **д) выказванні знакамітых асоб**, напр.: *гнюсная хлусня і статыстыка* < *Lies, damned lies, and statistics* (выраз англійскага дзяржаўнага дзеяча Б. Дызраэлі, прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі ў 1868 і 1874–1880 гг.; набыў крылатасць пасля таго, як быў ужыты ў аўтабіяграфіі М. Твэна "Chapters from My Autobiographie", 1907) і інш.

2. Няўласна англійскія першакрыніцы падзяляюцца на наступныя: **а) тэксты вуснай гутарковай мовы**, напр.: *прамыванне (прамыўка) мазгоў* < *brain-washing* (выраз паходзіць ад кітайскага выразу *hsi nao* 'мыць розум'; стаў крылатым пасля апублікавання артыкула амерыканскага журналіста Э. Хантэра "Brain-Washing' Tactics Force Chinese into Ranks of Communist Party" ў газеце "The Miami News", 24 верасня 1950 г. і выдання яго кнігі "Brain-washing in Red China", 1951) і інш.; **б) літаратурныя творы**, напр.: *Факты – рэч упартая (упартая рэч)* < *Facts are stubborn things* (выслоўе паходзіць з рамана А.Р. Лесажа "Histoire de Gil Blas de Santillane", 1715–1735; стала шырока вядомым пасля выдання яго англійскага перакладу, зробленага англійскім пісьменнікам Т. Смолетам, – "The Adventures of Gil

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Blas of Santillane", 1749) і інш.; **в) выказванні знакамітых асоб**, напр.: *пятая калона* < *"Fifth Column"* (выраз з прамовы па радыё іспанскага генерала Э. Мола, які камандаваў франкісцкімі войскамі ў гады грамадзянскай вайны ў Іспаніі ў 1936–1939 гг., у час яго наступлення на Мадрыд летам 1936 г.; паўтораны іспанскім палітычным дзеячам Д. Ібаруры ў артыкуле "La Defensa de Madrid – la Defensa de Espaca", надрукаваным у газеце "Mundo Obrero" 3 кастрычніка 1936 г.; набыў крылатасць пасля выхаду ў свет аднайменнай п'есы Э. Хемінгуэя, 1938) і інш.

Літаратура

1. Крылатыя выразы ў беларускай мове: Ч. 1: З іншамоўных (еўрапейскіх і амерыканскіх) крыніц XII – XX стст.: тлумачальны слоўнік / пад рэд. Я.Я. Іванова. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2004. – 136 с.

2. *Лепешаў, І.Я.* Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск: БелЭн, 2004. – 448 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова